Мікола КОЗЕНКА
(г. Мінск)

# З ПРАКТЫЧНАГА ВОПЫТУ АРГАНІЗАЦЫІ ФАЛЬКОРНЫХ ФЭСТАЎ У БЕЛАРУСІ: 1990–2006 гг.

Людзі, апантаныя будучым свайго народа, заўсёды рады бачыць тых, хто далучаецца да яго каранёвай традыцыі – этнічнага мастацтва, мовы, звычаяў і абраднасці. Праблема існавання традыцыі ў час імклівых змен у грамадстве падаецца сучаснай, але, насамрэч, яна ўваходзіць каранямі ў глыбіню стагоддзяў. Сапраўды, да таго, што раней было натуральным, мы мусім сёння праз высілкі далучаць, далучаць да традыцыйнага мастацтва і культуры Беларусі. Але працэс далучэння ідзе. Сёння можна казаць, што вынік сумесных намаганняў шэрагу навукоўцаў-даследчыкаў і энтузіястаў, апантаных народнай творчасцю беларусаў, – гэта асобная плынь жыцця краіны: фальклорны моладзевы рух. Ён цалкам у рэзанансе з культурнымі плынямі ва Усходне- і Цэнтральнаеўрапейскім рэгіёнах мяжы стагоддзяў. Акалічнасці існавання гэтага руху адлюстраваны і ў практыцы правядзення народных свят і фальклорных фестываляў у Беларусі за апошнія 2 – 3 дзесяцігоддзі. Працэс пайшоў, працэс свядомы і падсвядомы. Ідзе супольная праца па далучэнні да традыцыі ўсіх узроставых груп: ад дзяцей з дзіцячага садка да працоўнай моладзі. На сённяшнім фальклорным фестывалі "Берагіня", які адбыўся 1 – 4 чэрвеня 2006г., асобным выканаўцам за 30 гадоў. Гэта сапраўды "дарагога каштуе"; гэта сведчанне, што праяўляе ініцыятыву "адзначыцца на этнамастацкай хвалі" не толькі кіраўніцтва ўстаноў культуры і адукацыі, але і сама наша моладзь.



Першыя крокі ў далучэнні да беларускага ў сферы прафесійнага мастацтва, аматарскай творчасці, фестывальнага руху былі зроблены шмат гадоў таму. Тады з прадбачаннем таго, як павінна быць, калектывы народна-сцэнічнага танца імкнуліся мець у рэпертуары беларускую праграму на 40 хвілін. Але амаль ва ўсіх больш-менш вядомых беларускіх калектывах былі прадстаўлены расійскія танцы, украінскія гапакі, румынскія і малдаўскія скокі, танцы балтыйскіх народаў. Як бачым, шмат. Аднак беларускіх танцаў была найменшая колькасць. У 1994 годзе ў Пінску быў наладжаны Міжнародны фестываль фальклору, да ўдзелу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў якім былі запрошаны носьбіты традыцый аўтэнтычнага выканання песень і танцаў Беларусі, пераважна з гісторыка-этнаграфічнага рэгіёну Падняпроўе (Магілёўшчына). Фестываль меў даволі шырокі рэзананс, але пераважна ў колах спецыялістаў па фальклору.



Сёння зразумела, што гістарычна-аб'ектыўна ў 1990-х гг. на Беларусі закладзены асновы працы па захаванні аўтэнтычнага фальклору і далучэнні дзяцей да фальклорнай спадчыны (традыцыйнага мастацтва сваёй вёскі, сваёй малой радзімы). Але працэс ішоў вельмі павольна і складана. Дзеці выхоўваліся на зусім іншай культуры. Я быў сведкам правядзення і адным з арганізатараў першага рэгулярнага фестывалю ў краіне, дзе свядома рабіўся акцэнт на побытавы, не апрацаваны харэографамі-прафесіяналамі этнічны танец беларусаў. Фестываль атрымаў назву "Беларуская полька" і ладзіўся ў Чачэрску на Гомельшчыне. Цыкл гэтых фестываляў доўжыўся па 2001 год. Апошнім з іх быў IV Рэспубліканскі фестываль "Беларуская полька".

Наступны фестываль, да арганізацыі якога я далучыўся – "Берагіня" на Гомельскім Палессі* (былая Рудабелка, зараз г.п. Акцябрскі) – быў спачатку зарыентаваны на аднаўленне рэгіянальных формаў фальклору, найбольш пашыраных ў гэтай мясцовасці. У перыяд з 1999г.[1] да 2006г. гэты фэст стаўся рэгулярным і рэспубліканскім, бо яго імпрэзы трывала вабяць шырокае кола знаўцаў, носьбітаў і спажыўцоў народнага мастацтва [2].

1 - 4 чэрвеня 2006 года адбыўся чарговы Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня". Яго канцэпцыя, мадэль (2-х гадовыя адборачныя туры ў кожнай вобласці Рэспублікі Беларусь і фінальныя 4-х-дзённыя фестывальныя імпрэзы на Рудабельшчыне) скіраваныя на аб'яднанне намаганняў Міністэрства адукацыі, Міністэрства культуры, органаў культуры і адукацыі на ўзроўні гарадоў, вобласцяў і раёнаў у адным кірунку – кірунку спрыяння развіццю народнага мастацтва ў яго каранёвых асяродках (на вёсцы). Падрыхтоўка і арганізацыя фестывалю цяжка рухаецца, нягледзячы на тое, што ў "Плане мерапрыемстваў па рэалізацыі Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі", які зацверджаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, пазначана: "...штогод трэба праводзіць фестывалі, якія маюць ідэалагічны і патрыятычны характар, выхоўваюць любоў да Радзімы, да сваёй краіны". Але афіцыйная інстытуалізацыя "Берагіні" як рэспубліканскай, добра падрыхтаванай і прафінансаванай падзеі, рухаецца павольна.

---

* Ладзіцца ў г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл., тэл.+375 23 57 2 12 80, дырэктар фестывалю Святлана Беразоўская.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Недастатковую ўвагу фэсту надзяляюць рэспубліканскія СМІ, адказныя асобы з міністэрстваў.



Фестываль "Берагіня" шматкампанентны, шматузроўневы і складаны для павярхоўнага ўспрымання. Да распрацоўкі яго канцэпцыі далучаны буйныя спецыялісты ў галіне традыцыйнай культуры**. Часам мяне нават пытаюцца, ці не зашмат я патрабую ад дзяцей? Калі ўлічыць генетыку нашых дзяцей, падаецца, што не. Традыцыйна, у старажытнасці, дзіця ніхто не прымушаў сілком далучацца да скокаў, песень. Дзіця само генетычна цягнулася да гэтага: малеча стаяла за печкай і глядзела на свята, якое спраўлялі бацькі. Маладыя хлопцы нават танчылі са снапамі, калі паблізу не аказвалася дзяўчат, а танчыць было трэба. У зносінах у сям'і і грамадзе замацаваліся свае ўсеахопныя этыка і эстэтычныя каноны. Жыццё праходзіла ў адпаведнасці з выкрышталізаванай стагоддзямі нормай – традыцыяй. Таму, калі дзяўчаты бралі шлюб, яны былі цудоўнымі жонкамі і маці; хлопцы – добрымі мужамі і бацькамі. Усе разам – пераемнікамі і носьбітамі мастацтва той зямлі, на якой раслі, людзьмі, якія адметна ведалі мову і звычаі, ведалі дзе і як сябе паводзіць.

У нас безліч дзіцячых дамоў у краіне. Сёння гэта праблема. У Краснапольскім раёне смяротнасць у два разы перавышае раджальнасць. Калі так будзе працягвацца, Краснапольскага раёна не стане. Таму праца з дзецьмі – рэальная дапамога будучаму краіны. Няхай як мага глыбей людзі будуць уцягнуты ў сваю культуру, няхай менш часу будзе ў іх на гарэлку і лайдачанне.

На IV Рэспубліканскім фестывалі "Берагіня" (2006) былі распрацаваны два праекты, два турніры: II Рэспубліканскі турнір фальклорных калектываў і I Рэспубліканскі турнір салістаў. Праекты праводзіліся паралельна.

Фальклорныя турніры складаліся з 4-х праграм:

1. Харэаграфічнае мастацтва
2. Музычнае мастацтва
3. Дэкаратыўна-побытавае мастацтва
4. Моўная праграма

** Лабараторыя традыцыйнага мастацтва. Мінск, БелДІПК, тэл. +375 17 281 49 05, загадчыца Алена Боганева.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У харэаграфічнай праграме: конкурс танцавальных пар выканаўцаў народных побытавых танцаў, конкурс дзіцячых і маладзежных калектываў; пасля гэтага калектыў дэманстраваў адметнасць сваёй традыцыі (у кадрылі, польцы, вальсе). У розных групах тая ж "Лявоніха" разнастайная: сольная, парная, у тройках і г.д. Для гэтага трэба даследаваць сваю спадчыну, пры тым не па запісах, па слоўніках, а абавязкова наглядаючы – як танцуюць у народзе. Захаванне мясцовага стылю – абавязковая ўмова, што дапамагае кожнаму з выступоўцаў раскрыцца як асобе. Традыцыйнае народнае мастацтва адрозніваецца ад самадзейнасці, апелюе да этычных і эстэтычных асаблівасцей традыцыйнага светапогляду. Традыцыя дазваляе выхаваць этычныя адносіны да жанчыны, да маці, да іншага чалавека як да асобы. У традыцыйным асяродку п'янаму чалавеку ніколі б не дазволілі прыйсці на вячоркі. Самі ж удзельнікі яго б выправадзілі прэч.

Музычнае мастацтва на "Берагіні" – гэта абавязкова абрадавыя і пазаабрадавыя сольныя песні, ансамблевае выкананне песень сваёй мясцовасці. Паколькі фестываль праходзіць летам, то і рэпертуар – вяснова-летняга цыкла. Дзеці выконваюць песні, перанятыя ад сваіх бацькоў, дзядзькаў і цётак, бабуляў. Вітаецца выключна вусны, слыхавы шляхі навучання, а не развучванне па нотах! Як толькі пачынаюцца ноты і «акадэмізм» – губляеца традыцыйнасць. Асноўным жа з'яўляецца прынцып: "Рабі так, як твая маці, пераймай, засвойвай, імправізуй!" Пасля засваення стылю, манеры – кожны сам сабе пісьменнік, балетмайстар, кампазітар, паэт.



У праграме дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва дзеці ўдзельнічаюць у конкурсным вырабе: твор з саломкі, пояс, выцінанка, вышыўка. Удзел прымаюць прадстаўнікі кожнага калектыву. А яшчэ калектывы рыхтуюць хатняе заданне: на працягу двух гадоў іх удзельнікі вырабляюць набор-выставу ўзораў побытавага мастацтва свайго рэгіёна. Кожны калектыў прэзентуе сваю ўласную выставу ў вольнай форме.



4-я праграма – канцэртная. На 10-15 хвілін калектывы прадстаўляюць усё найлепшае, што пераняі ад старэйшых носьбітаў традыцыі ў сябе дома. Тут і розныя карагоды, і танцы, і музыка, і проза. Рэпрэзентуй сваю культуру ва ўсім аб'ёме за гэтыя 15 хвілін! Важна, каб усе былі апрануты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыгожа і традыцыйна. Калектыў павінен быць гуртом, супольнасцю ва ўсім.

Фестываль «Берагіня» праводзіць напярэдадні абавязковую навукова-практычную канферэнцыю «Традыцыйная культура і дзеці». Дзеці-чытальнікі канферэнцыі праходзяць адсеў у школах, раёнах. Лепшыя выходзяць на рэспубліканскі ўзровень. У канферэнцыі 2006 года прымалі ўдзел навукоўцы, практыкі і дзеці. Дзеці даследуюць сваю спадчыну і пішуць даклады на аснове даследавання з дапамогай настаўнікаў. У канферэнцыі задзейнічаны лепшыя сілы нашай гуманітарнай навукі. Напрыклад, эстэтык, доктар філасофскіх навук Ул.Конан наведаў вёску, у якой жывуць «фальклорныя» дзеці, рэгулярна ладзяцца фестывалі, ідзе пэўны этнакультурна-выхаваўчы рух. Дзеці пабачылі класіка беларускай культуры, там жа пазнаёміліся са знакамітым прафесарам А.Рагулям і музыказнаўцам Т.Варфаламеевай, якая мае непасрэднае дачыненне да найгрунтоўных выданняў па традыцыйнай культуры беларусаў [4]. Адмента выступіла этнафоназнаўца Т.Пладунова. Шкадую, што не атрымалася прыехаць у В.Калацэя, які мае цікавыя працы па гэтай праблематыцы

Падводзячы вынікі, скажу: сёння фестываль "Берагіня" – своеасаблівы комплекс этнакультурнага выхавання. Часам мае калегі здзіўляюцца, як яго можна было «працягнуць» праз нашы кансерватыўныя ўстановы адукацыі і культуры? Сёння гэта с і с т э м а  в ы х а в а н н я, якую нам пашчасціла адладзіць і запусціць: нарматыўныя стандарты адукацыі і культуры → бацькі і дзеці → выхаваўчы працэс школ і ўстаноў культуры. Заключныя фестывальныя імпрэзы – гэта чатыры праграмы: харэаграфічнае мастацтва (танцавальны конкурс), музычнае мастацтва (песенная творчасць, інструментальная творчасць), дэкаратыўна-пабытавае мастацтва (тры намінацыі: хатняе заданне, прэзентацыя выставы, конкурс), канцэртная праграма. Акрамя гэтага, кожны калектыў-удзельнік і калектыў-госць выступае з вольнай канцэртнай праграмай і выязджае з ёй на вёску. У 2006 г. у фэсце бралі ўдзел яго калектывы-спадарожнікі, якія сталелі разам з ім і якімі сёння можна ганарыцца – «Нежачкі», «Верабейкі», «Рудабельскія зорачкі». З самага пачатку фестываль праходзіць на Рудабельшчыне. У час Вялікай Айчыннай вайны сюды не дайшлі фашысты, таму захавалася шмат чаго з традыцыйнай культуры: і артэфактаў, і мадэляў паводзін. Гэта прыгожы край прыгожых людзей.

У якасці падвядзення вынікаў фестывалю ізноў адбудзецца навукова-практычная канферэнцыя, пройдуць розныя выставы, імпрэзы, будуць выдадзены даведнікі. На жаль, сёння грошай у бюджэце фэсту няма. Фестываль праводзіцца на дабрачыннай аснове. Кожны з жадаючых робіць свой унёсак, ахвяруе, што можа. .

Напрыканцы варта зазначыць наступнае:

- ад 1960-х гг., калі калектывы народна-сцэнічнага танца Беларусі імкнуліся да таго, каб мець у рэпертуары беларускую (часам намінальна) праграму на 40 хвілін, да буйных фестываляў  танцавальнага фальклору XXI ст. краінай пройдзены значны шлях па



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стварэнні сістэмы, запраграмаванай на аднаўленне фальклорнай традыцыі на месцах яе бытавання – на вёсцы.

● шэраг цікавых фестывальных ініцыятыў Міністэрства культуры рэспубліканскай і міжнароднай накіраванасці (у 1994 годзе ў Пінску быў наладжаны Міжнародны фестываль фальклору) не мелі працягу і абмежаваліся фэстамі для клубнай аматарскай сцэны, якія не ўплываюць на стан аўтэнтычнага фальклору, этнаэкалогіі беларусаў.

● створаныя па выкладках навукоўцаў-фалькларыстаў лакальныя фестывальныя праекты на перыферыі (рэспубліканскі фэст "Берагіня" на Рудабельшчыне) сталі напачатку XXI ст. своеасаблівым комплексам этнакультурнага выхавання, які, нягледзячы на мінімальную падтрымку дзяржавы, спрыяе захаванню традыцыі ў краіне і ахове этнаэкалогіі беларусаў.

## Літаратура


1. "Берагіня" : першы фестываль фальклорнага мастацтва. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1999. - 204 с.
2. Віцебскае Падзвінне / Т.Б.Варфаламеева, М.А.Козенка, А.М.Боганева і інш.; склад. Т.Б.Варфаламеева.— Мінск : Бел.навука, 2001. – 902 с. – (Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т.; т.2).
3. Козенка, М. Аб выніках рэалізацыі Рэспубліканскага эксперыментальнага праекта "Танцавальны фальклор і дзеці" / М.Козенка // Традыцыйная культура і дзеці / укл. М.Козенка. – Мінск : БелДІПК, 2004. - Вып.1. – С. 7–11.
4. Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б.Варфаламеева, В.І.Басько, М.А.Козенка і інш.- Мінск : Бел.навука, 2001. – 802 с. – (Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т.; т.1).




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ